Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
БДУКМ
_____С.Л.Шпарло
"06" 04 2023 г.
Рэгістрацыйны №ВД-6-034/эвуч.

# АЎТАМАТЫЗАВАНЫЯ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ СІСТЭМЫ

*Вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць, зацверджанага Першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 18.01.2023 № 6-05-03-007/пр., вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*М. А. Яцэвіч,* прафесар кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Р. С. Матульскі,* загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і менеджменту прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокага», доктар педагагічных навук, прафесар;

*Т. С. Жылінская,* загадчык кафедры інфармацыйных тэхналогій у культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ВУЧЭБНАЙ:**

Кафедрай інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 28.06.2023 г.);

Прэзідыўмам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 05.07.2023 г.)

**УЗГОДНЕНА**

Вучоны сакратар дзяржаўнай
установы «Беларуская сельскагаспадарчая
бібліятэка імя І. С. Лупіновіча» Нацыянальнай
акадэміі навук Беларусі

_____Ю.А. Каракулька

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна ―Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы” з’яўляецца інтэграванай. Яна – адна з вучэбных дысцыплін, якая забяспечвае агульнатэарэтычную і практычную базу падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне аўтаматызацыі бібліятэк. Яе вывучэнне абумоўлена шырокім укараненнем у практыку работы бібліятэк сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і неабходнасцю набыцця будучымі спецыялістамі адпаведных ведаў і ўменняў.

Вучэбная дысцыпліна структуравана па раздзелах і тэмах, якія ўяўляюць сабой адносна самастойныя ўзбуйненыя дыдактычныя модулі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца і спалучаецца з набытымі студэнтамі ведамі і ўменнямі пры вывучэнні абавязковых дысцыплін агульнанавуковага і агульнапрафесійнага цыкла – ―Асновы інфармацыйных тэхналогій”, ―Тэорыя інфармацыі і дакументалогія”, ―Бібліятэказнаўства”, ―Бібліяграфазнаўства”, ―Аўтаматызацыя апрацоўкі тэкставай інфармацыі”. У сваю чаргу веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні гэтай вучэбнай дысцыпліны, з’яўляюцца асновай для засваення матэрыялу іншых спецыяльных дысцыплін, у прыватнасці такіх, як ―Інфармацыйныя рэсурсы», ―Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне”, ―Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент” і інш.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне ў будучых спецыялістаў прафесійных кампетэнцый, якія звязаны са здольнасцю выконваць бібліятэчна-інфармацыйныя працэсы ў асяроддзі сучасных аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (АБІС).

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны – авалоданне студэнтамі тэарэтычнымі ведамі ў галіне аўтаматызацыі бібліятэк і АБІС; фарміраванне практычных уменняў эксплуатацыі і падтрымкі аўтаматызаваных бібліятэчных тэхналогій.

Для набыцця прафесійнай кампетэнцыі ў выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен*:*

*ведаць*

– тэрмінасістэму, стан і праблемы аўтаматызацыі бібліятэк;

– сутнасць АБІС і іх класіфікацыю;

– прынцыпы пабудовы АБІС;

– арганізацыйна-функцыянальную структуру розных АБІС;

– жыццѐвы цыкл аўтаматызаванай сістэмы;

– сродкі забеспячэння сістэмы;

– сеткавыя тэхналогіі АБІС;

– рынак прыкладнога праграмнага забеспячэння АБІС і праблемы яго выбару;

*умець*:

− прадстаўляць бібліятэку як аб’ект аўтаматызацыі;

− выбіраць і ўводзіць у АБІС разнастайныя сродкі інфармацыйна-лінгвістычнага забеспячэння;

– працаваць у асяроддзі дзейных АБІС і сетак;

− выкарыстоўваць web-інтэрфейс АБІС;

*валодаць*:

− тэхналогіяй эксплуатацыі найбольш распаўсюджаных АРМаў АБІС;

− методыкай выбару АБІС на інфармацыйным рынку.

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы» заснавана на эфектыўных педагагічных методыках і тэхналогіях, якія садзейнічаюць набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач: тэхналогія праблемнага навучання; праектная тэхналогія; камунікатыўная тэхналогія; метад аналізу і мадэлявання вытворчых сітуацый. Фарміраванне практычных уменняў ажыццяўляецца непасрэдна ў асяроддзі найбольш распаўсюджаных айчынных і замежных АБІС, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэках Беларусі.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны ―Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы” павінна забяспечыць фарміраванне наступнай базавай прафесійнай кампетэнцыі: выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці агульныя прынцыпы і падыходы да аўтаматызацыі бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў і эксплуатацыі аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычны комплекс.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы» выкарыстоўваюцца аўдыторная, пазааўдыторная (самастойная работа студэнтаў) і групавыя формы заняткаў. Асобныя заданні выконваюцца на базе бібліятэк базавых арганізацый, а таксама ўключаюцца ў праграму вытворчай (тэхналагічнай) практыкі.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы» ўсяго адведзена 220 гадзін, з якіх 110 – аўдыторныя заняткі. прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 56 гадзін – лекцыі, 44 гадзіны – лабараторныя заняткі, 10 гадзін – семінарскія заняткі. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Мэта вучэбнай дысцыпліны і яе задачы. Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў, сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Структура дысцыпліны.

Асноўныя аўдыторныя заняткі і формы пазааўдыторнай работы пры вывучэнні дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Характарыстыка асноўных крыніц па дысцыпліне. Формы бягучага, прамежкавага і выніковага кантролю.

### Раздзел І. Тэарэтычныя асновы АБІС

#### *Тэма 1.Сутнасць аўтаматызацыі бібліятэк. Паняцце АБІС*

Паняцце і тэрмінасістэма аўтаматызацыі бібліятэк. Мэты, задачы, змест, маштабнасць аўтаматызацыі бібліятэк.

Стан аўтаматызацыі ў бібліятэках Беларусі і іншых краінах свету: агульны параўнальны аналіз.

АБІС як вынік аўтаматызацыі бібліятэкі. Вызначэнне АБІС як разнастайнасці АІС. Паняцце АБІС у ~~в~~узкім” і ~~ш~~ырокім” сэнсе. АБІС як складаны арганізацыйна-тэхнічны і тэхналагічны комплекс.

Сродкі забеспячэння АБІС: агульная характарыстыка. Класіфікацыя АБІС.

#### *Тэма 2. Бібліятэка як аб’ект аўтаматызацыі*

Кампанентная структура бібліятэкі і АБІС. Тыпізацыя бібліятэк як аб’ектаў аўтаматызацыі. Сістэмны падыход да аўтаматызацыі бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў. Паняцце бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў, падпрацэсаў, аперацый, стадый, якія падвяргаюцца аўтаматызацыі. Асноўныя тэхналагічныя бібліятэчныя працэсы ў аўтаматызаваным рэжыме: камплектаванне, апрацоўка (каталагізацыя), захоўванне, інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне, бібліятэчнае абслугоўванне, электронная дастаўка дакументаў, кіраванне бібліятэкай і інш.

Мадэліраванне як метад аналізу і выбару параметраў будучай АБІС. Тэхналагічная дакументацыя: пааперацыйныя схемы, тэхналагічныя карты, тэхналагічныя інструкцыі.

### *Тэма 3. Прынцыпы пабудовы АБІС*

Аналіз існуючых поглядаў на прынцыпы пабудовы аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм. Базавыя прынцыпы распрацоўкі новых, удасканалення функцыяніруемых ці ўкаранення ўжо існуючых АБІС. Прынцып ідэнтычнасці і яго рэалізацыя ў тыпізацыі праектных рашэнняў. Прынцып пераймальнасці. Адкрытасць АБІС. Прынцып інтэграванасці і яго праяўленне ў аднаразавай апрацоўцы інфармацыі, карпаратыўнасці і сеткавай інтэграцыі. Прынцып сумяшчальнасці. Апаратная (тэхнічная), інфармацыйная і праграмная сумяшчальнасць у АБІС. Прынцып адаптыўнасці. Пашырэнне, маштабіруемасць і мабільнасць (гнуткасць) АБІС. Прынцып кіравання і маніторынгу.

### *Тэма 4. Арганізацыйна-функцыянальная структура АБІС*

Паняцце арганізацыйна-функцыянальнай структуры і архітэктуры АБІС, іх узаемасувязь.

Функцыянальная структура АБІС. Функцыянальныя падсістэмы. Службовыя, сістэмныя і карыстальніцкія падсістэмы. Функцыянальныя задачы.

Аўтаматызаваныя рабочыя месцы (АРМ) як асноўны спосаб рэалізацыі функцыянальных падсістэм і задач аўтаматызацыі працы бібліятэчнага работніка. АРМы і праграмныя модулі, іх суадносіны. Віды праграмных модуляў. Крытэрыі распрацоўкі АРМаў. Класіфікацыя АРМаў па функцыянальным прызначэнні і месцы выкарыстання.

Тэхналагічныя магчымасці найбольш распаўсюджаных ―класічных” АРМаў: "Камплектатар", "Каталагізатар", "Чытач", "Кнігавыдача", ―Кнігазабяспечанасць”, "Адміністратар" і інш. (на прыкладзе АБІС Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, БІТ-2000u, ALIS-WEB, ІРБІС, МегаПро (MARC-SQL). RFID-тэхналогіі АБІС.

### *Тэма 5. Жыццёвы цыкл АБІС*

Паняцце ″жыццёвага цыкла″ аўтаматызаваных сістэм. Комплекс дзяржаўных стандартаў на аўтаматызаваныя сістэмы. Стадыі і этапы іх стварэння і ўкаранення.

Праектаванне АБІС. Фарміраванне патрабаванняў да будучай сістэмы. Перадпраектнае даследаванне бібліятэкі як аб'екта аўтаматызацыі. Распрацоўка канцэпцыі сістэмы. Распрацоўка тэхнічнага задання. Эскізнае праектаванне. Тэхнічнае праектаванне. Рабочае праектаванне і распрацоўка рабочай дакументацыі.

Увод АБІС у дзеянне. Падрыхтоўка бібліятэкі да ўводу сістэмы ў дзеянне. Падрыхтоўка персаналу. Камплектацыя сістэмы праграмна-тэхнічным комплексам і інфармацыйна-лінгвістычным забеспячэннем. Мантажныя

работы. Пуска-наладачныя работы. Правядзенне папярэдніх выпрабаванняў. Правядзенне вопытнай эксплуатацыі. Прыёмачныя іспыты.

Суправаджэнне АБІС. Выкананне работ у адпаведнасці з гарантыйнымі абавязкамі. Паслягарантыйнае абслугоўванне.

Адміністрыраванне АБІС. Санкцыяніраванне доступу і абарона інфармацыі ў сістэме.

Змена пакалення АБІС у бібліятэцы.

## Раздзел ІІ. Сродкі забеспячэння АБІС

### *Тэма 6. Інфармацыйнае забеспячэнне*

Склад і роля інфармацыйнага забеспячэння (ІЗ) АБІС. Віды інфармацыі, якія цыркулююць у АБІС.

Паняцце фармата АБІС. Структура фарматаў: даныя, палі, запісы, файлы.

Віды фарматаў. Унутраныя фарматы. Камунікатыўныя фарматы. Фарматы UNIMARC і BELMARC, іх суадносіны; іншыя камунікатыўныя фарматы, якія выкарыстоўваюцца ў сучасных АБІС.

Тэхналогія ўводу ў АБІС бібліяграфічных запісаў у фармаце BELMARC з аўтарытэтным кантролем. Структура бібліяграфічнага запісу ў фармаце BELMARC.

Базы даных АБІС: віды, структура, асаблівасці пабудовы.

Патрабаванні да ІЗ АБІС.

### *Тэма 7. Лінгвістычнае забеспячэнне*

Прызначэнне лінгвістычнага забеспячэння (ЛЗ). Сродкі лінгвістычнага забеспячэння, якія выкарыстоўваюцца ў АБІС. Мова апрацоўкі бібліятэчна-бібліяграфічных даных. Класіфікацыйныя мовы. Дзескрыптарныя мовы і інфармацыйна-пошукавыя тэзаўрусы. Аб′ектна-прыметавыя мовы. Мовы арфаграфічнага кантролю і транслітэрацыі. Мовы запытаў і маніпуліравання данымі. Лінгвістычныя працэсары.

Мова аўтарытэтных/нарматыўных файлаў. Склад аўтарытэтных файлаў. Міжнародныя і нацыянальныя службы аўтарытэтных файлаў. Фарміраванне банка аўтарытэтных файлаў. Тэхналогія ўводу аўтарытэтных файлаў у фармаце BELMARC.

Рынак баз даных асобных сродкаў ЛЗ. Характарыстыка ЛЗ найбольш распаўсюджаных АБІС.

Тэхналогія фарміравання і выкарыстання ЛЗ у сістэме. Сродкі падтрымкі ЛЗ. Патрабаванні да ЛЗ АБІС.

### *Тэма 8. Праграмнае забеспячэнне*

Агульнае (стандартнае) праграмнае забеспячэнне (ПЗ). Аперацыйныя сістэмы, сістэмы кіравання базамі даных (СКБД) і сервісныя праграмы (уціліты), якія выкарыстоўваюцца ў АБІС, іх віды.

Мовы праграмавання для АБІС: агульная характарыстыка. Сеткавае ПЗ АБІС. СКБД АБІС: прызначэнне, структура, арганізацыя. Характарыстыка СКБД, якія выкарыстоўваюцца ў АБІС: MS-SQL, Oracle, Sybase, CDS/ISIS і інш.

Прыкладное ПЗ АБІС. Пакеты прыкладных праграм (ППП): агульная характарыстыка.

Вольнае і ліцэнзаванае ПЗ, асаблівасці выкарыстанне ў сістэме.

Праграмная дакументацыя.

Патрабаванні да ПЗ АБІС.

### *Тэма 9. Тэхнічнае забеспячэнне*

Камп′ютарныя і перыферыйныя ўстройствы. Віды працэсараў, маніторaў, прынтараў, сканераў, мадэмаў, якія выкарыстоўваюцца ў АБІС.

Сеткавае абсталяванне АБІС. Сродкі мультымедыа.

Тэхнічнае абслугоўванне АБІС.

Выбар і патрабаванні да тэхнічнага забеспячэння АБІС.

### *Тэма 10. Арганізацыйна-кадравае і эрганамічнае забеспячэнне*

Паняцце арганізацыйна-кадравага забеспячэння. Склад персаналу АБІС. Адміністратары БД. Сістэмныя адміністратары. Сістэмныя аналітыкі. Праграмісты. Інжынеры-электронікі. Аператары ПЭВМ. Намеснікі дырэктараў бібліятэк па інфармацыйных тэхналогіях, загадчыкі аддзелаў аўтаматызацыі. Іх функцыянальныя абавязкі. Дакументацыя, якая рэгламентуе работу персанала ў аўтаматызаванай сістэме.

Структура і арганізацыя работы аддзелаў аўтаматызацыі бібліятэк. Палажэнні аб аддзелах.

Падрыхтоўка кадраў для АБІС.

Паняцце эрганомікі АБІС. Арганізацыя працоўных месцаў карыстальнікаў. Умовы работы з персанальнымі камп'ютарамі. Камп'ютарныя сіндромы. Санітарныя і гігіянічныя патрабаванні. Мікраклімат у бібліятэцы (тэмпература, вентыляцыя, асвятленне) і яго ўздзеянне на функцыяніраванне сістэмы.

## Раздзел ІІІ. Сеткавыя тэхналогіі АБІС

### *Тэма 11. Internet як аснова функцыянавання АБІС*

Internet як інфармацыйна-камунікацыйнае асяроддзе функцыянавання АБІС. Web-шлюзы ў АБІС. Спосабы падключэння АБІС да Internet. Web-інтэрфейс АБІС. Месца АБІС у бібліятэчным Internet-комплексе. Адрасы (сайты) бібліятэчных web-сэрвераў сістэмы. Браўзеры для прагляду старонак бібліятэчных web-сервераў. Спецыяльныя пратаколы перадачы і атрымання даных. Сэрвісы Internet ў асяроддзі АБІС. Паняцце і выкарыстанне «воблачных тэхналогій» у АБІС.

Пошук інфармацыі з выкарыстаннем web-інтэрфейса АБІС. Глабальныя і даведачныя пошукавыя сістэмы (машыны). Тыпы інфармацыйных запытаў, якія можна выканаць з іх дапамогай. Сістэма OPAC для пошуку бібліяграфічнай інфармацыі ў электронных каталогах.

### *Тэма 12. Лакальныя тэхналогіі АБІС*

Прызначэнне і асаблівасці лакальных бібліятэчных камп’ютарных сетак (ЛБКС). Кампаноўка ЛБКС. Тэхналогія функцыяніравання. Метады перадачы паведамленняў. Сеткі тыпу Ethernet.

Асноўныя падыходы да класіфікацыі лакальных сетак. ЛБКС па архітэктуры пабудовы, іх прызначэнне і асаблівасці. Сервер баз даных і сервер дадаткаў. Кліенцкая частка.

ЛБКС па тапалогіі (канфігурацыі) сеткавых спалучэнняў: "шына", "кальцо", "зорка", "дрэва". ЛБКС па відах пабудовы, колькасці выкарыстоўваемых ПЭВМ, арганізацыі перадачы інфармацыі, тыпу выкарыстоўваемых сродкаў, спосабу кіраўніцтва і інш.

### *Тэма 13. Карпаратыўныя тэхналогіі АБІС*

Паняцце карпаратыўных (размеркавальных) бібліятэчных камп'ютарных сетак (КБКС). Карпаратыўныя бібліятэчныя парталы. КБКС тыпу Intranet, іх асноўныя віды і тэхналогія функцыяніравання. Пратаколы перадачы даных у КБКС. Пратакол Z39.50.

Функцыяніраванне АБІС у карпаратыўным рэжыме работы. Тэхналогія карпаратыўнай каталагізацыі і рэтраканверсіі каталогаў, электроннай дастаўкі дакументаў, экспарту/імпарту інфармацыі. Зводны электронны каталог як адна з асноўных падсістэм КБКС.

Кансорцыўмы як арганізацыйная структура КБКС. Класіфікацыя бібліятэчных кансорцыумаў па розных прыметах. Буйнейшыя кансорцыумы свету. Бібліятэчныя кансорцыумы ў Рэспубліцы Беларусь.

### *Тэма 14. Электронныя бібліятэкі і электронная дастаўка дакументаў як падсістэмы АБІС*

Паняцце і перавагі электронных бібліятэк (ЭБ). Виды ЭБ.

Способы стварэння электронных бібліятэк. Тэхналогія алічбоўкі дакументаў. Асаблівасці тэхналагіі пабудовы электронных бібліятэк як падсістэм АБІС. Патрабаванні да праграмна-тэхнічнага комплексу.

Нацыянальныя і міжнародныя праекты ЭБ.

Паняцце электроннай дастаўкі дакументаў (ЭДД). Тэхналогія ЭДД у АБІС. Арганізацыя ЭДД у бібліятэцы.

Уздзеянне аўтарскага права на развіццѐ электронных бібліятэк і электроннай дастаўкі дакументаў.

## Раздзел IV. Рынак праграмнага забеспячэння АБІС

### *Тэма 15. Структура рынку праграмнага забеспячэння АБІС*

Рынак праграмнага забеспячэння (ПЗ) як сегмент інфармацыйнага рынку. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнага рынку ПЗ АБІС. Пастаўшчыкі сістэм. Пасрэднікі. Умовы паставак. Цанавая палітыка.

Праблемы ліцэнзавання і аховы правоў уласнасці на ПЗ АБІС.

Асацыяцыі (клубы) карыстальнікаў сістэм.

Рынак ПЗ АБІС эканамічна развітых краін свету: ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Нідэрландаў, Ізраіля і інш. Праграмнае забеспячэнне АБІС краін СНД. Рынак праграмнага забеспячэння АБІС Беларусі.

Методыка вывучэння рынку ПЗ АБІС і апаратных сродкаў да сістэм.

### *Тэма 16.* Праблемы выбару прыкладнога праграмнага забеспячэння АБІС

Працэдура выбару сістэмы. Ацэнка рэальных патрэб і магчымасцей бібліятэкі. Фарміраванне пераліку патрабаванняў да АБІС. Улік патрабаванняў і галінова-рэгіянальных асаблівасцей карыстальнікаў.

Ацэнка якасці і выбар праграмных сродкаў і абсталявання. Формы даследавання якасці праграмнага забеспячэння АБІС. Вывучэнне ″жыццяздольнасці″ распрацоўшчыка (пастаўшчыка) сістэмы, гарантыі.

Вывучэнне магчымасцей карпаратыўнага набыцця праграмнага забеспячэння АБІС. Цанавыя скідкі. Умовы паставак, навучанне сістэме і яе суправаджэнне. Арганізацыя тэндара. Вядзенне перамоў з пастаўшчыком, падрыхтоўка дакументацыі і заключэнне дагавора на пастаўку.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | | |
| Уводзіны | 1 | | | | |
| **Раздзел І. Тэарэтычныя асновы АБІС** | | | | | |
| *Тэма 1.* Сутнасць аўтаматызацыі бібліятэк і АБІС | 2 | | | 2 | Групавое абмеркаванне |
| *Тэма 2.* Бібліятэка як аб'ект аўтаматызацыі | 2 | | 2 | 2 | Падрыхтоўка тэхналагічных картаў |
| *Тэма 3.* Прынцыпы пабудовы АБІС | 2 | 2 | | 2 | Групавое абмеркаванне |
| *Тэма 4*. Арганізацыйна-функцыянальная структура АБІС | 3 | | 6 | | |
| *Тэма 5.* Жыццёвы цыкл АБІС | 2 | 2 | 2 | 2 | Групавое абмеркаванне Тэст па раздзелу |
| **Раздзел ІІ. Сродкі забеспячэння АБІС** | | | | | |
| *Тэма 6.* Інфармацыйнае забеспячэнне | 4 | | 4 | 2 | Прадстаўленне лабараторных работ |
| *Тэма 7.* Лінгвістычнае забеспячэнне | 4 | | 6 | | |
| *Тэма 8.* Праграмнае забеспячэнне | 4 | | | 2 | Напісанне рэфератаў |
| *Тэма 9.* Тэхнічнае забеспячэнне | 2 | | 2 | 2 | Падрыхтоўка прэзентацый |
| *Тэма 10.* Арганізацыйна-кадравае і эрганамічнае забеспячэнне | 2 | 2 | | 2 | Групавое абмеркаванне Тэст па раздзелу |
| **Раздзел ІІІ. Сеткавыя тэхналогіі АБІС** | | | | | |
| *Тэма 11.* Internet як аснова функцыянавання АБІС | 2 | | 4 | 2 | Падрыхтоўка рэфератаў |
| *Тэма 12.* Лакальныя тэхналогіі АБІС | 4 | | 4 | 2 | Падрыхтоўка прэзентацый |
| *Тэма 13.* Карпаратыўныя тэхналогіі АБІС | 2 | | | | |
| *Тэма 14.* Электронныя бібліятэкі і электронная дастаўка дакументаў як падсістэмы АБІС | 4 | | 4 | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Раздзел ІУ. Рынак праграмнага забеспячэння АБІС** | | | | | |
| *Тэма 15.* Структура рынку праграмнага забеспячэння АБІС | 2 | | | | |
| *Тэма 16.* Праблемы выбару прыкладнога праграмнага забеспячэння АБІС | 2 | 2 | 2 | 2 | Падрыхтоўка рэферата ў |
| **Усяго** | **44** | **8** | **36** | **22** | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## (завочная форма атрымання адукацыі)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | |
| Уводзіны | 0,5 | | | |
| **Раздзел І. Тэарэтычныя асновы АБІС** | | | | |
| *Тэма 1.* Сутнасць аўтаматызацыі бібліятэк і АБІС. Бібліятэка як аб'ект аўтаматызацыі | 1,5 | | | Падрыхтоўка тэхналагічных картаў |
| *Тэма 2.* Прынцыпы пабудовы, арганізацыйна-функцыянальная структура і жыццёвы цыкл АБІС | 2 | | 4 | Прадстаўленне лабараторных работ Тэст па раздзелу |
| **Раздзел ІІ. Сродкі забеспячэння АБІС** | | | | |
| *Тэма 3.* Інфармацыйна-лінгвістычнае забеспячэнне | 2 | | 2 | Прадстаўленне лабараторных работ |
| *Тэма 4.* Праграмна-тэхнічнае забеспячэнне забеспячэнне | 2 | | | Падрыхтоўка прэзентацый |
| *Тэма 5.* Арганізацыйна-кадравае і эрганамічнае забеспячэнне | 1 | 2 | | Тэст па раздзелу |
| **Раздзел ІІІ. Сеткавыя тэхналогіі АБІС** | | | | |
| *Тэма 6.* Лакальныя і карпаратыўныя тэхналогіі АБІС | 1 | | 4 | Падрыхтоўка прэзентацый |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 7.* Электронныя бібліятэкі і электронная дастаўка дакументаў як падсістэмы АБІС | 1 | | | Падрыхтоўка рэфератаў<br>Тэст па раздзелу |
| **Раздзел IУ. Рынак праграмнага забеспячэння АБІС** | | | | |
| *Тэма 8.* Структура рынку і праблемы выбару АБІС | 1 | 2 | | Падрыхтоўка рэфератаў |
| **Усяго** | **14** | **4** | **10** | Тэст па вучэбнай дысцыпліне |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


1. *Алешин, Л. И.* Обеспечение автоматизированных библиотечных информационных систем (АБИС) : [учеб. пособие] / Л. И. Алешин. - Москва : Форум, 2016. – С. 109-383.
2. *Колкова, Н. И.* Информационное обеспечение автоматизированных библиотечно-информационных систем (АБИС) : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям /Н. И. Колкова, И. Л. Скипор. - 2-е изд. - Москва : Юрайт, 2020. – С. 51-218.
3. *Рахматуллаев, М. А*. Проектирование информационно-библиотечных систем [Электронный ресурс] : учеб. / М.А. Рахматуллаев. — Москва : ИНФРА-М, 2024. — С. 6-183. — Режим доступа: https://znanium.com/catalog/product/.


*Дадатковая*


1. *АБИС ALIS WEB* [Электронный ресурс].− Режим доступа: *http://www.ineak.by/catalogue/view-250?menu_id=73*
2. *АБИС МегаПро* [Электронный ресурс].−Режим доступа: http://www.data-express.ru
3. *Воройский, Ф.С.* Основы проектирования автоматизированных библиотечно-информационных систем.− Изд. 2-е, доп. и перераб./ Ф.С. Воройский. - Москва: Физматлит, 2007 . − 521 с. : ил. 25; табл. 19.
4. *ГОСТ 34.003-90.* Информационная технология. Комплекс стандартов на автоматизированные системы. Термины и определения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://belotest.by/gost/001.001.040.035/gost-34.003-90/ .– Дата доступа: 11.02.21.
5. *ГОСТ 34.601-90* Информационная технология. Комплекс стандартов на автоматизированные системы. Автоматизированные системы. Стадии создания [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://docs.cntd.ru/document/gost-34-601-90. – Дата доступа: 11.02.2021.
6. *Григянец, Р.Б.* Облачные технологии в автоматизации библиотечной и информационной деятельности в Национальной академии наук Беларуси // Р. Б. Григянец, Ю. В. Костюкевич, Ж. М. Молчан [Электронный ресурс].− Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2016/disk/017.pdf.– Дата доступа: 11.02.21.
7. *ИРБИС.* Система автоматизации библиотек [Электронный ресурс].− Режим доступа:

http://www.elnit.org/index.php?option=com_content&view=article&id=35&Itemid=108.– Дата доступа: 11.02.21.

8. *Корпоративная* система автоматизации библиотек на основе интернет-технологий БИТ-2000u / Объединенный институт проблем информатики Национальной академии наук Беларуси. – Режим доступа: http://uiip.bas-net.by/work/dev_uiip/1968/. – Дата доступа: 13.05.2016.

9. *Левова, Л.В.* Новые архитектурные решения в АИБС «МегаПро» / Л.В.Левова [Электронный ресурс].– Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2018/disk/057.pdf.– Дата доступа: 11.02.21.

10. *Протопопова Е. Э.* Функционирование библиотек в облачной телекоммуникационной среде / Е. Э. Протопопова // Науч. и техн. б-ки. – 2016. – № 2. – С. 42–54.

11. *Редькина Н. С.* Эффективные веб-технологии в деятельности библиотеки / Н. С. Редькина // Науч. и техн. б-ки.– 2017 . – № 3. – С. 15–2

12. *Самсонова, М.В.* Комплексный подход к автоматизации библиотек с помощью линейки программных продуктов «1С:Библиотека» [Электронный ресурс].– Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2018/disk/042.pdf.–Дата доступа: 11.02.2021.

13. *Смирнов*, Ю. В. Сопоставительный анализ зарубежного и российского программного обеспечения, используемого в библиотечной сфере / Ю. В. Смирнов// Научные и технические библиотеки. - 2023. - № 12. - С. 97-115. - Библиогр.: 5 назв.

14. *Соколинский К. Е.* Новая технология создания сводных каталогов и корпоративных электронных библиотек в J-ИРБИС 2.0 : [Вестник Ассоциации ЭБНИТ. Вып. 16] / К. Е. Соколинский // Науч. и техн. б-ки. – 2015. – № 11. – С. 83–100

15. *Тимошенко И. В.* Система поддержки электронных читательских билетов САБ ИРБИС64 – возможности интеграции: [Вестник Ассоциации ЭБНИТ. Вып. 17] / И. В. Тимошенко // Науч. и техн. б-ки. – 2016. – № 11. – С. 127–131.

16. *Тимошенко И. В.* RFID-оборудование в библиотеках: вопросы выбора и применения / И. В. Тимошенко. – Науч. и техн. б-ки.– 2017.– № 3. – С. 43–53.

17. *Шрайберг, Я.Л.* Основные положения и принципы разработки автоматизированных библиотечно-информационных систем и сетей/ Я.Л Шрайберг.: учеб.-практ. пособие.– 2-е изд., испр. и доп.– Москва: Либерия, 2001.– 102 с.

18. *Шрайберг, Я.Л.* Принципы построения автоматизированных библиотечно-информационных систем и сетей.: дисс. в виде научного доклада на соиск. ученой степени докт. техн. наук/ Я.Л.Шрайберг – М.: ГПНТБ, 1999.– 40 с.

19. *Яцевич, Н.А.* Автоматизация библиотек: проблемы терминологии/ *Н.А. Яцевич* // Науч. и техн. б-ки. − 2007. – № 2.− С. 50 − 54.

20. *Яцэвіч, М.А.* Карпаратыўныя бібліятэчныя сістэмы і іх роля ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў Беларусі/ М.А.Яцэвіч.// Информационное обеспечение науки Беларуси: прошлое, настоящее, будущее.– Минск.: Нац. акад. наук Беларусі, 2003.– С.– 42–50.

21. *Яцэвіч, М.А.* Рынак АБІС Беларусі: структурна-функцыянальны аналіз/ Яцэвіч М.А.// Бібліятэчны свет.– 2002.– № 3.– С. 35 – 40.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу студэнтаў з навуковай, вучэбна-метадычнай літаратурай, нарматыўна-тэхнічнай і тэхналагічнай дакументацыяй. Яна ўключае таксама падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў, заліка і выніковага экзамену.

Самастойная работа (пры неабходнасці) таксама ўключае завяршэнне выканання лабараторных работ, якія распачаты ў вучэбнай аўдыторыі.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па адной з тэм, пералік якіх змешчаны ў вучэбна-метадычным комплексе па вучэбнай дысцыпліне. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з’яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму.

Пры абмеркаванні вынікаў СРС асаблівую ўвагу неабходна звяртаць на засваенне студэнтамі: інтэграванага выканання бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў у асяроддзі АБІС; тэхналагічных асаблівасцей аўтаматызаваных бібліятэчных сістэм, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэках Беларусі; новых падыходаў ў выкарыстанні сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і сродкаў забеспячэння функцыянавання сістэмы; карпаратыўнага ўзаемадзеяння розных АБІС; арганізацыі работы персанала.

### Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

− правядзенне бягучай і прамежкавай атэстацыі атудэнтаў;

– выкананне лабараторных работ;

– прамежкавае тэсціраванне па раздзелах, а таксама па дысцыпліне цалкам;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарскіх занятках і індывідуальна па распрацаваных тэмах;

– экзамен